Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (145), 2024

УДК 821.161.3-3:7.071.1 EDN: PCAWIX

# Вобраз мастака ў творах «Люцыян Таполя» М. Танка і «Бондар» З. Бядулі

А.І. ЛЯШЭНКА

Артыкул прысвечаны аналізу твораў «Бондар» Змітрака Бядулі і «Люцыян Таполя» Максіма Танка. У артыкуле разглядаюцца асаблівасці перадачы выявы мастака. Вывучаюцца адметныя рысы творцы і яго мастацкай дзейнасці. Аналізуецца сувязь мастака з жыццём народа, а таксама значымасць твораў, якія па-мастацку праўдзіва адлюстроўваюць рэчаіснасць. Праводзіцца супастаўляльны аналіз вобразаў мастакоў з абодвух твораў, параўноўваюцца асаблівасці іх светапогляду і ўнутраных перажыванняў.
**Ключавыя словы:** мастак, творчасць, вобраз, яскравае ўвасабленне, талент, чулая душа.

This article analyzes the works «Cooper» by Zmitrok Byadula and «Lukian Tapolia» by Maxim Tank. The article discusses the features of conveying artist's image. The distinctive features of the creator and his artistic activity are being studied. The artist's connection with the life of people is analyzed, as well as the significance of works that artistically truthfully reflect reality. A comparative analysis of the artists of both poems is carried out, the features of their worldview and internal experiences are compared.
**Keywords:** artist, creativity, image, bright embodiment, talent, sensitive soul.

Імя Максіма Танка з'яўляецца адным з самых яркіх у гісторыі беларускай літаратуры, ён шырока вядомы як паэт, філосаф, патрыёт роднага краю, наватар у сферы тэматыкі і паэтыкі мастацкіх твораў. Ягоная паэзія ўражвае разнастайнасцю тэм, вобразаў, творчым засваеннем нацыянальнай паэтычнай традыцыі і наватарствам. Адной з самых галоўных тэм у творчасці М. Танка з'яўляецца Радзіма ў самых розных яе праявах і ўвасабленнях.

У ягонай спадчыне нямала твораў, прысвечаных тэме мастацтва. Як і Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, народны паэт дэманструе цесную сувязь мастака з жыццём народа, падкрэслівае значымасць твораў, якія па-мастацку праўдзіва адлюстроўваюць рэчаіснасць. Менавіта таму тэма мастака і мастацтва аб'ядноўвае твор «Люцыян Таполя» Максіма Танка з паэмамі «Курган» Янкі Купалы і «Сымон-музыка» Якуба Коласа, апавяданнямі «Музыка» Максіма Багдановіча і «Бондар» Змітрака Бядулі.

Змітрака Бядулю таксама хвалявалі праблемы мастацкай дзейнасці, кардынальныя асаблівасці і тэндэнцыі яе развіцця. Ён заўсёды акцэнтуе ўвагу на сутнасці таленту, ролі ўнутраных перажыванняў і натхнення ў свядомасці чалавека, тайнах і законах мастацтва. У перыяд глыбокіх роздумаў З. Бядуля надае асаблівую ўвагу праблеме народнага мастацтва, яго генезісу і эвалюцыі. Прафесар З. Мельнікава падкрэслівае задачы народнага мастацтва ў разуменні пісьменніка: «Вывучэнне і захаванне духоўнай і матэрыяльнай спадчыны народа павінна стаць важнай задачай для адукаванай беларускай моладзі. Ён пераконваў: усё, у чым праяўляецца адметнасць, "душа народа", неабходна збіраць, запісваць, фатаграфаваць. Бо гэта і ёсць хараство і багацце. <…>». Яна ж справядліва падкрэслівае, што «тэма мастака і мастацтва ў класавым грамадстве хвалявала класікаў нашай літаратуры пачатку XX ст.» [1, с. 76].

Вядомы крытык Ігнат Дварчанін сцвярджае адметнасць Змітрака Бядулі ва ўспрыманні творчасці як аднаго з асноўных заняткаў чалавека, бо пісьменнік меў своеасаблівы светапогляд, што тлумачылася і ягоным паходжаннем: «Творчасць З. Бядулі стаіць вельмі блізка да творчасьці сялянскіх пісьменьнікаў. Але ўжо з самых раньніх твораў заўважаецца і розьніца. Бядуля выступае, як поэт хараства. Ня ёсьць яшчэ гэта сьвядомае служэньне хараству, стварэньне культу яго, як гэта будзем бачыць пасьля пісьменьнікаў формы і прыгоства. Бядуля адчувае хараство душою, ён жыве гэтым хараством, для яго хараство – скарбніца поэзіі, крыніца натхнення. <…> Другое месца ў творчасьці Бядулі займае быт сялян. Яго гора, злыбеды, перажаваньні выступаюць у сваёй непрыкрытай, рэальнай запраўднасьці. Часамі заўважаецца, што пісьменьнік падыходзіць да яго, як пабочны наглядчык, спакойны, яму сымпатызуючы» [1, с. 76].

Дадзеныя праблемы набылі найбольш яскравае ўвасабленне ў апавяданні «Бондар», надрукаваным пад псеўданімам Ясакар у 1920 г. ў газеце «Беларусь» і прысвечаным тэме мастака і мастацтва, нябачным повязям паміж рамеснікам і вынікам ягонай дзейнасці. Перад

намі сапраўдны мастак, хоць і займаецца ён такой, здавалася б, будзённай працай. Пісьменнік з замілаваннем пералічвае шматлікія грані таленту бондара, але асабліва падкрэслівае яго беззапаветную адданасць любімай справе: «Мэтай яго жыцця былі не заработкі, а праца сама па сабе, той любімы час працы, які дае праўдзівае шчасце майстру» [2, с. 165]. Звычайны селянін уваходзіць у кагорту вялікіх творцаў сусветнай культуры. Аўтар падкрэслівае паэтычную натуру Данілы, якога лёгка пакрыўдзіць і нават параніць.

Гэта вельмі добра разумее жонка героя твора Аўдоцця, якая настолькі захоплена майстэрствам свайго мужа, што практычна раствараецца ў ім, жыве яго дасягненнямі і надзеямі: «Нельга сказаць, што Даніла нудзіўся пры рабоце. Яго жыццё было поўна для яго цікавасці. Жонка Аўдоцця ўсім простым, добрым і падатлівым сэрцам наскрозь была пранята майстэрствам Данілы. Яго адгалосак, як цень свайго мужа, яна жыла яго жыццём, радавалася яго радасцям, гаравала яго горам; падабалася ёй тое, што яму было даспадобы, і ганьбіла тое, што ён не любіў. Ён быў як бы сонцам, а яна – планетай, якая кружылася вакол сонца» [2, с. 165]. У мастацкіх творах класічнай літаратуры жонкі мастакоў або не разумеюць сваіх сужэнцаў, або становяцца паплечнікамі. Гэта добра ўвасоблена ў навэле А. Камю, у якой паказана трагедыя мастака, які не можа справіцца з умовамі рэальнага існавання.

Незвычайнасць герояў твораў пісьменніка даўно адзначана нашай крытыкай. Як сцвярджае Г. Кісліцына, «Уяўленне свайго “я”, індывідуалізм пісьменніка накладваюць адбітак на постаці лірычных герояў нават самых бытавых, рэалістычных абразкоў (такіх, як “За тканінай”, “Араты”, “Ля вапеннай гары”, “На гай высокі” і інш.). Героі Бядулі не толькі востра адчуваюць, маюць чулую душу – уся іх сутнасць накіравана на гэтае “ўслухоўванне” ў рэчаіснасць, якую яны прапускаюць праз сябе. Тое, што некаму можа здацца дробяззю, нявартай увагі, лірычным героем Бядулі ўспрымаецца як падзея, патрабуючая тэрміновага рэагавання» [3, с. 66–67].

Нешта падобнае характэрна для творчасці Максіма Танка. Ягоны верш «Люцыян Таполя» таксама з’яўляецца сапраўдным усхваленнем творчасці і таленту, уласцівым людзям. Галоўны герой твора – народны майстар Люцыян Таполя, вядомы па мянушцы Багароб. Вобраз Люцыяна Таполі адзін з самых значных вобразаў мастакоў, створаных Максімам Танкам. У аснове твора ляжыць лёс таленавітага мастака і канфлікт паміж Люцыянам Таполя і біскупам Сямашкам. Гэта адвечны двубой паміж творцам і тымі, хто мае ўладу і грошы. Яго не пазбег і сам паэт. Як адзначаў даследчык беларускай паэмы М.М. Арочка, «у вобраз Люцыяна Таполі, народнага майстра, паэт укладваў шмат чаго ад уласнай самасвядомасці і бунтоўнасці натуры» [4, с. 166]. Даследчык сцвярджае, што да гэтага вобраза Максім Танк ішоў паступова, праз нарастанне драматызму, праз арыентацыю «на ўнутраны роздум… “Люцыян Таполя” з’явіўся іменна такім творам, які на шырокай пляцоўцы гістарычнага, умоўна ўведзенага ў задуму матэрыялу адкрываў магчымасці загаварыць пра мужнасць мастака» [4, с. 165–166].

Герой Максіма Танка тварыў на зямлі горнее, высокае, боскае, але набліжаў нябёсы да зямлі, бачачы найвялікшую прыгажосць не ў анёлах, а якраз у мясцовых людзях, якія і ствараюць багацце гэтага краю, твораць тую красу, што была некалі ў Эдэме. У свой час так рабілі вялікія мастакі эпохі Адраджэння, на карцінах якіх ажывалі рэальныя асобы. У вершы беларускага паэта жыхары неба былі падобнымі «да сялян смаргонскіх, да вілейскіх лесарубаў, рыбакоў». А вобраз дзяўчыны Тэклі, каханай майстра, нагадвае гераіню славутай Песні песняў [5, с. 2].

У паэме Максіма Танка таксама дамінуе імкненне героя стварыць значнае і вялікае, што зможа змагацца з часам і нават вечнасцю. Таму невыпадкова падкрэсліваецца, што праз мары Люцыяна Таполі выказаны спадзяванні самога творцы [6, с. 2]. Слушна напісаў пра гэта М.М. Арочка: «Неспакойная дума не пакідала ні паэта, ні яго героя – стварыць “сказ” пра запаветнае, споўніць сваё эстэтычнае прызначэнне, выяўляючы рэальны стан рэчаў» [4, с. 166]:

Дума неспакойная жыла ў майстра:
Ён хацеў пакінуць пакаленням
След жыцця свайго,
Сваіх пакут,
Сказ пра мары,
Пра свае імкненні... [7, с. 205].

Талент мастакоў знаходзіць водгук, бо яны пазначаны незвычайнай сілай уздзеяння на людскія душы, на ўсё жывое і нежывое. Таму і адбываюцца гіпербалізавана-неверагодныя, фантастычныя пераўтварэнні, мастак становіцца сапраўдным чараўніком [5, с. 2]. Так, пад рукамі Люцыяна Таполі:

Бы ад нейкіх чараў,
Ажывала нават нежывое,
Немагчымае рабілася магчымым:
Гнуўся камень,
А з звычайнай цэглы,
Быццам з бронзы,
Паўставалі здані… [7, с. 206].

Зразумела, мастак заўсёды знаходзіцца ў соцыўме, бо жыць у грамадстве і быць незалежным ад грамадства нельга. У сваім апавяданні «Бондар» Змітрок Бядуля хоча паказаць, што творца ніколі не знойдзе паразумення з агрэсіўным натоўпам. Чалавек, які валодае далікатным духоўным унутраным светам, глядзіць на звычайных людзей «звышку, нібы ведае вельмі важную, вялікую таемнасць, якую ім недаступна ведаць» [2, с. 165]. Пісьменнік падкрэслівае заўсёдны антаганізм паміж мастаком і звычайным людам, але вінаваціць у гэтым не толькі апошняга: «майстар не павінен ганарліва адасабляцца ад людзей; свае талент і ўмельства трэба перадаваць іншым людзям, кожнаму неабходна бачыць і цаніць хараство жыцця і сваімі талентамі і працай упрыгожваць свет і жыццё людзей» [8, с. 26].

Змітрок Бядуля як сапраўдны паэт акцэнтуе ўвагу на самым пачатку работы і характарызуе сутнасць працэсу творчасці дзвюма словамі – «Цуд пачынаецца». Пісьменнік падкрэслівае неабходнасць знешніх фактараў для стварэння адпаведнай творчай атмасферы, якую так лёгка парушыць: «муха не павінна гудзець, мыш не павінна скрабці, ды наогул, ніхто з жывых істот не мае права перашкаджаць майстру» [2, с. 168]. Кожная творчая асоба заўсёды спадзяецца на адпаведны водгук на сваю працу. Калі пані робіць заказ Данілу на канкрэтныя вырабы, ён адчувае, што яго заўважылі і змаглі ацаніць здольнасці. Падобная падтрымка натхняе, надае дадатковыя сілы, дазваляе паглыбіцца ў творчы працэс настолькі, што творца забываецца пра яду і сон. Але, што дзівуе, працэс работы, як і надзея на тое, што яе вынікі будуць высока ацэнены, нібы скідваюць гады з немаладога Данілы. Тым болей трагічна ўспрымаецца фінал твора. Пані, у вобразе якой ўвасоблена грамадства, абыякава адносіцца да начыння, зробленага прафесійна і дасканала, не можа ацаніць талент. Пагардліва ставіцца да працы Данілы, абыякавая да яго стараннясць. Непаразуменне знішчае не толькі вырабы майстра, але і яго самога. Душа таленавітага чалавека заўсёды складаная, далікатная, яе лёгка параніць нават адным словам ці знявагай. Мастак пакутуе, калі парушаецца ўнутраны свет, калі губляецца ўвага да яго і падтрымка, бо ён чакае справядлівага прысуду, які надае яму новыя сілы, натхняе на задумы, спрыя новым знаходкам. Праўда, пісьменнік падкрэслівае, што тут трэба быць дыялектыкам, бо нельга поўнасцю ігнараваць аднавяскоўцаў і цалкам спадзявацца на пані, якая ўспрымаецца як ісціна ў апошняй інстанцыі.

Бондар Даніла паўстае як наіўны чалавек, што ўзвёў пані на п’едыстал, паверыў у яе асаблівую чуйнасць да хараства. А. Бязлепкіна-Чарнякевіч у артыкуле «Пісьменніцкая публіцыстыка як ключ да разумення мастацкай творчасці на прыкладзе апавядання “Бондар” Змітрака Бядулі» сцвярджае: «калі зірнуць на твор вачыма наіўнага рэцыпіента, то найперш вылучаецца такі тэзіс: “непавага забівае мастака”. Гэтая думка ўпісваецца агулам у творчасць пісьменніка, бо З. Бядуля – аматар экзальтаваных сюжэтных рашэнняў, але ў вачах вучняў можа выглядаць моцным перабольшваннем: пані заплаціла майстру за працу, выканала ўсе дамоўленасці, а любіць і шанаваць яго яна не абавязана, як і не абавязана адпавядаць яго чаканням, пра якія яна нават не здагадвалася» [1, с. 77]. Таленавіты бондар з «залатымі рукамі» памірае. Даніла перастае ствараць свае вырабы, якімі калісьці славіўся на ўсю вёску, бо далікатнае эга мастака цалкам знішчана, нішто яго больш не захапляе, смерць мастака цягне за сабою гібель асобы. Ён становіцца маўклівым і панурым, закідвае свае інструменты, якія з часам іржавеюць. Як антытэзіс гучыць аўтарская рэмарка, што хаваюць бондара Данілу ў шурпатай і нязграбнай труне. І толькі яго жонка Аўдоцця заўважае: «Якім бы вокам Даніла глянуў на гэтую непрыгожую труну?» [2, с. 172].

Тым часам персанажу М. Танка, прадстаўніку народнай творчасці – Люцыяну Таполі, супрацьстаіць біскуп Сямашка. Як гэта часта сустракаецца ў беларускай літаратуры, Люцыян Таполя прадстаўлены як неардынарная асоба, якой супрацьпастаўляецца персанаж-антыпод – біскуп, надзелены неабмежаванай уладай. Мастак не можа ўзняцца на адкрыты бунт ці пратэст, але ён змагаецца ўласнымі сродкамі, мастакоўскімі. У сваіх тварэннях Люцыян Таполя (Багароб) надаў біблейскім абразам «апосталаў, пракоркаў» аблічча звычайных зямных людзей, падобных да тых, сярод якіх Хрыстос апавядаў свае прыпавесці. Песняй аб няспраўджаным каханні стала гераіня батлейкі, рысы якой разьбяр скапіяваў з вясковай прыгажуні Тэклі. Іншыя вядомыя і дасканалыя персанажы ягоных скульптур выклікалі захапленне і радасць простых людзей, але прыводзілі ў лютасць і гнеў Сямашку.

У рэалістычнасці вырабаў Люцыяна Таполі біскуп бачыў не вялікі талент іх стваральніка, а злачынства. У сувязі з чым і пакараў Багароба, загадаўшы знішчыць вынікі яго карпатлівай працы і не дакранацца да інструментаў на цэлае дзесяцігоддзе. Для Люцыяна Таполі дадзенае пакаранне аказалася роўназначным страце сэнсу існавання і духоўнай смерці. Але, у адрозненне ад героя З. Бядулі бондара Данілы, ён знаходзіць у сабе сілы для змагання. Забарона тварыць натхняе на далейшыя пошукі: Люцыян Таполя вырашыў адпомсціць: майстар упрыгожыў храм хімерамі і пачварамі падобнымі да тых, хто пакрыўдзіў людзей:

На абсыдах
Нейкія расселіся хімеры.
Гэта – тыя, што хацелі знішчыць,
Пагасіць святло у яго сэрцы.
З іх адны падобны да магнатаў,
Да сабак – да панскіх цівуноў,
А другія – да дзяцей Лайолы –
Хітрых езуітаў,
Да айца Сямашкі [7, с. 207].

Люцыян Таполя сцвердзіў права мастака на творчую свабоду, ягоную рашучасць змагацца за свае ідэалы. Ворагі былі пакараны адметнай зброяй, якой валодаюць творцы.

А. Петрушкевіч лічыць, што «святыня, збудаваная Люцыянам Таполем, – гэта песня мастака. Песня велічы, праўды і нязгоды. Бо творца не стаў на шлях змовы з ворагам людскасці. Адначасна гэтая святыня, узведзеная Люцыянам Таполем, – гэта самы дасканалы помнік творцу» [5, с. 4].

## Літаратура

1. Бязлепкіна-Чарнякевіч, А. Пісьменніцкая публіцыстыка як ключ да разумення мастацкай творчасці на прыкладзе апавядання «Бондар» Змітрака Бядулі / А. Бязлепкіна-Чарнякевіч. – Роднае слова. – 2023. – № 7. – С. 75–79.

2. Бядуля, З. Збор твораў : у 5 т. / З. Бядуля – Мінск : Маст. літ., 1986. – Т. 2 : Вершы ў прозе. Лірычныя імпрэсіі. Апавяданні. – 351 с.

3. Кісліцына, Г. М. Лірычная мініяцюра як жанр беларускай літаратуры / Г. М. Кісліцына ; навук. рэд. І. Э. Багдановіч. – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 118 с.

4. Арочка, М. М. Максім Танк : жыццё ў паэзіі / М. М. Арочка. – Мінск : Нав. і тэхніка, 1987. – 272 с.

5. Петрушкевіч, А. М. Вобраз мастака ў паэмах Янкі Купалы «Курган» і Максіма Танка «Люцыян Таполя» / А. М. Петрушкевіч // Восьмыя Танкаўскія чытанні : матэрыялы Міжнар. навуковай канферэнцыі, Мінск, 13–14 верас. 2012 г. / Беларус. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В. Д. Старычонак [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2012. – 223 с.

6. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 10 кл. агульнаадук. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання (базавы і павышаны ўзровень) / Г. Я. Адамовіч [і інш.] ; пад рэд. Д. Я. Бугаёва. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 317 с.

7. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – Т. 7 : Паэмы. – 368 с.

8. Беларуская літаратура ў 10 класе : вучэб.-мэтад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэл. адук. з беларус. і рус. мовамі навучання / З. П. Мельнікава [і інш.]. – Мінск : НІА, 2011. – 189 с.

Гомельский государственный
университет имени Франциска Скорины

Поступила в редакцию 06.10.2023